УДК 631.437

В. П. КАВАЛЁЎ

УПЛЫЎ УШЧЫЛЬНЕННЯ ГЛЕБЫ НА ЎРАДЖАЙНАСЦЬ КАРМАВЫХ КУЛЬТУР

Ва ўмовах Гомельскай вобласці, дзе больш за 70% глеб лёгкага механічнага саставу (з іх 42,8% падсцілаюцца пяскамі), пастаянна вядуцца пошукі аптымальных варыянтаў асноўнай і перадпасяўной апрацовак глебы. Усё шырэй выкарыстоўваецца новая прагрэсіўная тэхналогія пры вырошчванні сельскагаспадарчых культур — мінімальная апрацоўка глебы. У яе аснове ляжаць не толькі эканамічныя меркаванні, але і неабходнасць аптымізацыі ўмоў жыцця раслін. Для кожнай культуры да пачатку вегетацыйнага перыяду неабходна стварыць аптымальную шчыльнасць ворнага слоя глебы. Апрацоўка глебы з'яўляецца адным з фактараў рэгулявання фізічных умоў у ёй, хоць нельга адмаўляць кароткачасовасці ўплыву агульнапрынятых прыёмаў апрацоўкі на гэтыя ўмовы. Мадэльныя доследы па вывучэнні рэакцыі раслін кукурузы (1986—1988 гг.) і віка-аўсянай сумесі (1987—1989 гг.) на шчыльнасць глебы праводзіліся на Палескай сельскагаспадарчай доследнай станцыі.

Глеба доследнага ўчастка дзярнова-падзолістая, супясчаная, якая з глыбіні 1 м падсцілаецца марэнным суглінкам. Магутнасць ворнага слоя — 19—22 см, колькасць фізічнай гліны — 10,9, гумусу — 1,8%, pH_{KCl} — 5,6, рухомага фосфару — 15,1 і абменнага калію — 11,7 мг/100 г глебы. Фосфарна-калійныя ўгнаенні ўносілі ўвосень пад узворванне ў дозе $P_{80}K_{100}$ пад усе культуры, азотныя ўгнаенні (аміячную салетру) у дозе 90 кг/га д.р. — па 45 кг у два тэрміны. Арганічныя ўгнаенні ў колькасці 60 т/га ўносілі пад кукурузу па гарызонтах 0—10 і 10—20 см. Высяваліся віка сорту Белацаркоўская 222, авёс Эрбграф, гібрыд кукурузы Калектыўны 110. Глыбіня загортвання насення кукурузы 6 см, віка-аўсянай сумесі — 4 см.

У перыяд сяўбы ажыццяўлялася ўшчыльненне або разушчыльненне глебы адпаведна схеме доследу (табл. 1). У якасці кантролю прымаўся вар. I без парушэння ўтворанага ворнага слоя глебы, які пасля рыхлення на глыбіню загортвання насення складаў 1,4 г/см^3. У іншых варыянтах зададзеная аб'ёмная маса ўтваралася раўнамерным набіваннем у выкапаныя ямы (50×50, глыбіня 20 см). Папярэдне вынятая раздзельна глеба па гарызонтах 0—10 і 10—20 см, згодна са схемай доследу, ушчыльнялася або разушчыльнялася без перамяшчэння гарызонтаў з інтэрвалам 0,1 г/см^3. Уліковыя пляцоўкі ўнутры па межах ізаляваліся поліэтыленавай плёнкай шырынёй 25 см (20 см у глебу і 5 см